ДУК "Свіслацкая раённая бібліятэка"
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу



# Краязнаўчы каляндар

## знамянальных і памятных дат на 2024 год

Свіслач, 2023

*У распаўсюджванні гістарычных звестак аб тым ці іншым краі, людзях, якія яго праславілі, гарадах і вёсках, установах культуры і адукацыі важная роля належыць календарам знамянальных і памятных дат. Яны ўваходзяць у склад краязнаўчых рэкамендацыйных дапаможнікаў і прызначаны бібліятэчным работнікам у дапамогу іх шматграннай краязнаўчай дзейнасці, работнікам сродкаў масавай інфармацыі і музеяў, якія займаюцца распаўсюджваннем краязнаўчых ведаў, а таксама ўсім, каго цікавіць гісторыя і сучаснасць роднага края.*

*У інфармацыйнае выданне "Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат на 2024 год" уключаны найбольш значныя даты з гісторыі, эканамічнага і культурнага жыцця Свіслаччыны, а таксама юбілейныя даты знакамітых ураджэнцаў і дзеячаў, якія пакінулі след у гісторыі нашага краю. Усе матэрыялы прыводзяцца ў парадку прамой храналогіі, сістэматызаваны па каляндарным прынцыпе са студзеня па снежань, у межах кожнага месяца – па чыслах. Падзеі, храналогія якіх устаноўлена толькі ў межах года, знаходзяцца ў пачатку календара.*

*Свіслацкая раённая бібліятэка з удзячнасцю прыме заўвагі, прапановы і дапаўненні да дадзенага выдання па адрасе: г.Свіслач, вул.Першамайская, д.4;*
*e-mail: lib@kultura-svisloch.by;*
*тэлефон 70074.*

# У 2024 годзе спаўняецца:

## 615 гадоў з пачатку фарміравання запаведнага рэжыму нацыянальнага парку “Белавежская пушча”



*Звесткі аб старажытным лесе Белавежскай пушчы сустракаюцца яшчэ ў V стагоддзі да н.э. у Герадота і ў Іпацьеўскім летапісе 983 года. Вядома, што з спрадвечных часоў палявалі тут на дзікіх звяроў, у тым ліку зуброў, тураў, высакародных аленяў, вялася вырубка леса. У 1409 годзе кароль Ягайла ўсталяваў абмежаванні на паляванне ў пушчы – з гэтага часу на буйнага звера маглі паляваць толькі сам кароль і Вітаўт. Мясцовым сялянам для пражытка дазвалялася здабываць дробную дзічыну і птушку. Гэта і стала свайго роду вытокам усталявання запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы.*

## 615 гадоў з часу першага ўпамінання аб в.Новы Двор





*Упершыню Новы Двор згадваецца ў 1409 годзе, як паляўнічая рэзідэнцыя, заснаваная князем Вітаўтам. У 1505 годзе вёска атрымала статус мястэчка, у 1661 годзе – Магдэбургскае права і мела свой герб. Новы Двор не раз станавіўся арэнай баявых дзеянняў і руйнаваўся падчас паходаў варожых войскаў. У сярэдзіне XVII стагоддзя вёску спалілі шведскія войскі. Падчас вайны з Напалеонам у*

*ваколіцах Новага Двара стаяла руская армія пад камандаваннем Баграціёна. У 1863 годзе адбылася бойня сарака казакоў з паўстанцамі. У 1921 годзе мястэчка ўвайшло ў склад Польшчы і статус мястэчка панізілі да вёскі. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе Новы Двор аказваецца на тэрыторыі Расійскай імперыі. У населеным пункце дзейнічалі царква, сінагога, народнае вучылішча, дробныя прадпрыемствы і пражывала паўтары тысячы чалавек. Згодна з Рыжскім мірным дагаворам у 1921 годзе Новы Двор увайшоў у склад Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства. У 1939 годзе – у складзе БССР, дзе 12 кастрычніка 1940 года стаў цэнтрам Навадворскага сельсавета. У 2007 годзе вёска набыла статус аграгарадка.*



## 145 гадоў з часу пабудавання царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў в.Ятвеск

*Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў в.Ятвеск пабудавана ў 1879 годзе на паўночнай ускраіне вёскі з цэглы, на фундаменце. Першым настаяцелем прыхода быў айцец Леанід Коласаў. Храм складаецца з асноўнага аб'ёма і прытвора са званіцай. Асноўны аб'ём пакрыты чатырохсхільным дахам з галоўкай. Аконныя праёмы ў прытворы і асноўным аб'ёме арачныя, здвоеныя, з паўкалонамі па баках. Дэкор фасадаў уключае арнаментальныя паясы, вугольныя лапаткі. У інтэр'еры перакрыцце трапезнай плоскае, у асноўным аб'ёме крыжападобнае скляпенне. Царква з'яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю.*





## *120 гадоў з часу адкрыцця чыгуначнай станцыі Свіслач*



*Чыгуначная станцыя Свіслач была адкрыта ў 1904 годзе. Па свайму прызначэнню з'яўляецца грузавой. Тут ажыццяўляецца прыём, здача і перагрузка экспартна-імпартных тавараў.*



*Станцыя Свіслач з'яўляецца ўнікальнай. Гэта адзінае месца на беларускай чыгунцы, дзе перастаўляюць вагоны. У пункце тэхнічнага абслугоўвання і перастаноўкі вагонаў дзве каляіны. З беларускай каляіны шырынёй 1520 мм вагоны перастаўляюць на вузкую еўрапейскую шырынёй 1435 мм і назад. 10 стойлаў з электрадамкратамі дазваляюць аднaчасова перастаўляць 10 вагонаў. Толькі на гэтай грузавой станцыі ўвесь чыгуначны шлях цалкам на ручным кіраванні, тут да гэтага часу працуюць стрэлачнікі.*



## *70 гадоў з часу ўвядзення ў эксплуатацыю будынка Свіслацкага райвыканкама*



## 65 гадоў з часу адкрыцця ў в.Відзейкі помніка землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны



*На ўшанаванне памяці 6 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у цэнтры в.Відзейкі ў 1959 годзе ўстаноўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.*

## 55 гадоў з часу адкрыцця помнікаў загінуўшым землякам ў населеных пунктах Вердамічы, В.Сяло, Занкі, Ханчыцы



*На паўднёвай ускраіне аг.Вердамічы ў 1969 годзе пастаўлены помнік землякам – скульптура партызана, дзяўчынкі і стэла.Увекавечана памяць 59 землякоў, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і 23 мясцовыя жыхары, загубленыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі.*

*На ўсходняй ускраіне аг.Вялікае Сяло знаходзіцца брацкая магіла землякоў, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны, ахвяр фашызму. Тут ўвекавечана памяць аб 128 земляках. У 1969 годзе ўстаноўлены помнік – скульптура партызана, дзяўчынкі і стэла.*





*У цэнтры в.Занкі, у скверы знаходзіцца брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі, іх сем'яў і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1969 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам. У 1990 годзе сюды былі*

*перапахаваны 6 чалавек з в.Грыцкі, расстраляных падчас Вялікай Айчыннай вайны (2 вайскоўцы і 4 мірныя жыхары).*




*У цэнтры аг.Ханчыцы ў 1969 годзе устаноўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам. Тут увекавечана памяць аб 21 земляку, загінуўшаму ў Вялікую Айчынную вайну.*

## 50 гадоў з часу адкрыцця ў Поразава дзіцячай музычнай школы



*У 1974 годзе ў цэнтры Поразава, у былым будынку дзіцячай бальніцы і майстэрні па рамонту абутку, адкрылася дзіцячая музычная школа, у якой навучалася 60 чалавек. З 1974 па 1990 год педагагічны калектыў узначальваў Аркадзій Еўстафьевіч Каштан, з 1990 года – Генадзій Уладзіміравіч Бутар.*

*У цяперашні час музычная школа з'яўляецца філіялам г.п.Поразава дзяржаўнай установы адукацыі "Свіслацкая дзіцячая школа мастацтваў". Дзеці маюць магчымасць займацца па класу баяна, акардэона, цымбал, фартэпіяна. Дадаткова могуць авалодаць навыкамі ігры на гітары. За гады існавання з сцен музычнай школы выйшлі сотні выпускнікоў. Сярод іх – лаўрэаты абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Пры музычнай школе створаны ансамбль народных інструментаў "Вянок", які мае званне "народнага" і прымае ўдзел у фестывалях, аглядах, конкурсах у рамках рэспублікі і за яе межамі.*



## 45 гадоў назад Свіслацкі раён узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, СМ БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ

*Па выніках сацыялістычных спаборніцтваў за 1978 год Свілацкі раён узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ за павелічэнне вытворчасці і продажу мяса пры адначасовым выкананні гадавога плана продажу малака дзяржаве, а таксама пераходзячым Чырвоным сцягам абкама партыі выканкама абласнога Савета дэпутатаў, аблсаўпрофа і абкама камсамола – за павелічэнне вытворчасці і продажу дзяржаве мяса, малака, бульбы і павелічэнне вытворчасці кармоў для грамадскай жывёлагадоўлі. 6 сакавіка 1979 года ў г.Свіслач адбылася раённая нарада партыйна-гаспадарчага актыву, на якім член бюро Гродзенскага абкама КПБ, старшыня аблсаўпрофа Л.П.Сікор уручыў узнагароды першаму сакратару райкома партыі І.К.Ярмашчуку.*



## СТУДЗЕНЬ

### Студзень – 60 гадоў з дня ўтварэння УСП “Новы Двор-Агра”

*Гісторыя прадпрыемства “Новы Двор-Агра” пачалася ў 1950 годзе з арганізацыі трох калгасаў: імя Калініна (вёскі Шурычы і Залесная), імя Дзяржынскага (вёскі Новы Двор, Вялікія Масушыны, Малыя Масушыны), імя Я.Коласа (вёскі Бойкавічы, Студзенікі, Працуцічы, Баяры, Янаўшчына, Бернікі, Навасёлкі, Цераспаль). У сакавіку 1959 года ў сувязі з рэарганізацыяй усе тры калгасы былі аб’яднаны з саўгасам “Паразоўскі”, які ў 1964 годзе па рашэнні Міністэрства харчавання і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў быў падзелены на тры саўгасы: “Паразоўскі”, “Новы*

*Двор”, “Гарнастаевічы”. Так, са студзеня 1964 года быў утвораны саўгас “Новы Двор”. Цэнтрам саўгаса стала вёска Новы Двор. Першым дырэктарам быў назначаны М.М.Рыбак. У 1965 годзе саўгас спецыялізаваўся на вырошчванні племяннога маладняку свіней. У 1973 годзе саўгас*



*перайменаваны ў племзавод “Новы Двор”. У 1977 годзе за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці племзавод быў узнагароджаны Дыпломам III ступені Галоўнага камітэта ВДНГ СССР. У 2001 годзе перайменаваны ў камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства “Новы Двор”, 14 чэрвеня 2013 года – ва*



*ўнітарнае сельскагаспадарчае прадпрыемства “Новы Двор-Агра”. У цяперашні час “Новы Двор-Агра” спецыялізуецца ў малочна-мясным накірунку, развіта вытворчасць зернавых культур. У сельскагаспадарчым прадпрыемстве налічваецца 3 вытворчыя ўчасткі па раслінаводству, 3 малочна-таварныя фермы, 2 фермы па вырошчванню маладняку буйна-рагатай жывёлы. У “Новы Двор-Агра” вырошчваюць чырвоную беларускую жывёлу малочнага напрамку, жывёлу герэфордскай пароды (мармуровая ялавічына), мяса якой валодае высокімі смакавымі якасцямі. Брыгадзір вытворчай брыгады ў*



*жывёлагадоўлі МТФ “Студзенікі” А.С.Мацейка ўзнагароджана медалямі “За працоўныя заслугі”, “100 гадоў органам дзяржаўнага кіравання сельскай гаспадаркай і харчаваннем Беларусі” і ў 2022 годзе – ордэнам Пашаны.*

**Студзень** — **15 гадоў з дня адкрыцця аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў дзяржаўнай установы "Свіслацкі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва"**



*У студзені 2009 года на базе дзяржаўнай установы "Свіслацкі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва" было адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў, мэта якога: арганізацыя сацыяльнага абслугоўвання непрацаздольных грамадзян: дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, якія завяршылі асваенне зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, што пацверджана пасведчаннем аб спецыяльнай адукацыі; інвалідаў 1 ці 2 групы, у форме паўстацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання. У аддзяленні арганізуюцца гурткі і клубы па інтарэсах, аматарскія аб'яднанні, арганізуецца дзейнасць па ўцягненні інвалідаў з улікам наяўных магчымасцей у розныя формы грамадскага жыцця, у творчую дзейнасць, фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы. У 2023 годзе аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў было перайменавана ў аддзяленне сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў.*



## 10 – 45 гадоў з дня нараджэння Андрэя Францавіча Праневіча, кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта па спецыяльнасці "Матэматыка", ураджэнца г.Свіслач



*Нарадзіўся 10 студзеня 1979 года ў Свіслачы. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэі імя Я.Купалы (2001). У 2002 годзе пасля магістратуры атрымаў акадэмічную ступень "Магістр прыродазнаўчых навук", у 2005 годзе пасля аспірантуры – вучоную ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук. У 2009 годзе прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці "Матэматыка". Працаваў настаўнікам матэматыкі гімназіі №1 г.Гродна (2001-2004), выкладчыкам, дацэнтам кафедры матэматычнага і інфармацыйнага забеспячэння эканамічных сістэм факультэта эканомікіі і ўпраўлення ГрДзУ імя Я.Купалы (2004-2007), старшынёй Савета маладых вучоных ГрДзУ імя Я.Купалы (2008-2009), начальнікам аддзела падрыхтоўкі і атэстацыі кадраў вышэйшай навуковай катэгорыі (2010-2012), дацэнтам (2013) і загадчыкам кафедры матэматычнага і інфармацыйнага забеспячэння эканамічных сістэм факультэта эканомікіі і ўпраўлення ГрДзУ імя Я.Купалы (2021-2022). У студзені 2022 года назначаны на пасаду прарэктара па навуковай рабоце. Удастоены стыпендыі імя П.Броўкі (2001), стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2005), атрымаў Грант Еўрапейскага матэматычнага таварыства для ўдзелу ў рабоце Еўрапейскага матэматычнага кангрэса (2012).*

## 14 – 40 гадоў з часу гібелі ў Афганістане Уладзіміра Аляксандравіча Залеўскага, ураджэнца в.Лашавічы. Пасмертна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі



*Нарадзіўся 5 снежня 1963 года ў в.Лашавічы. Закончыўшы Вердаміцкую сярэднюю школу, вырашыў ехаць да бабулі ў Сімферопаль, дзе вучыўся ў Сімферопальскім ДПТУ № 25. Пасля заканчэння тэхнікума 31 сакавіка 1982 года прызваны ва Узброеныя Сілы СССР Сімферопальскім РВК Крымскай вобласці. Першым месцам службы стала 15-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння ў г.Чырчык Узбекскай ССР, дзе яго накіравалі ў паветрана-дэсантную разведвальную роту. Але ўжо праз два месяцы Уладзіміра перавялі на новае месца службы: горад Мейменэ на поўначы Афганістана, недалёка ад граніцы з Туркменікістанам. У баі 14 студзеня 1982 года дзейнічаў у складзе групы прыкрыцця. Умела выкарыстоўваючы мясцовасць, кароткімі чэргамі вёў агонь. Яму ўдалося заняць выгадную пазіцыю, з якой ён агнём з кулямёта і гранатамі не даваў мяцежнікам падняцца ў атаку. У няроўным баі, які доўжыўся больш за 10 гадзін, У.Залеўскі загінуў. За мужнасць і адвагу ў 1984 годзе пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў в.Лашавічы.*



## 15 – 35 гадоў з дня заснавання народнай фальклорнай групы “Крынічанька” дзяржаўнай установы культуры “Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”



*Калектыў створаны ў 1989 годзе, у 1995 годзе прысвоена званне “народны”. Народная фальклорная група – пастаянны ўдзельнік раённых, абласных*

*фальклорных мерапрыемстваў. Калектыў актыўна працуе над вывучэннем і папулярызацыяй фальклорнай спадчыны роднага краю, далучае моладзь да традыцый мінулага. У 1993 годзе фальклорная група выступіла на тэлебачанні з абрадам "Свіслацкае вяселле", а пазней – з абрадам "Хрэсьбіны". "Крынічка" неаднаразова станавілася пераможцам абласных конкурсаў. Кіраўніком яе з'яўляецца Ірына Сцяпанаўна Ягорава.*



## 21 – 80 гадоў назад расстраляны актывісты Задворанскай падпольнай камсамольскай арганізацыі

*У гады Вялікай Айчыннай вайны ў пачатку 1942 года ў в.Задворанцы для барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі была створана антыфашысцкая група, якую ўзначаліў адзін са старэйшых актывістаў вёскі В.А.Усевіч. У арганізацыю ўвайшла ў асноўным моладзь, якая пачала помсціць ворагу. Збіралі зброю і хавалі яе ў надзейных месцах, знішчалі тэлефонную сувязь. У хуткім часе на базе антыфашысцкай групы ў Задворанцах ствараецца падпольная камсамольская арганізацыя. Сакратаром яе быў абраны 18-гадовы У.Усевіч. У сярэдзіне 1942 года падпольнай камсамольскай арганізацыі ўдалося наладзіць сувязь з партызанамі. Падпольшчыкі перадавалі народным мсціўцам зброю, харчы, хадзілі з партызанамі на баявыя заданні, былі праваднікамі, удзельнічалі ў "рэйкавай вайне", узрывалі чыгунку і масты. Фашысты даведаліся, што з імі вядзе барацьбу падпольная арганізацыя і вырашылі пакончыць з ёй. У пачатку студзеня 1944 года быў арыштаваны адзін з членаў арганізацыі. Два тыдні прасядзеў ён у гестапаўскіх засценках. Не вытрымаўшы катаванняў і пытак, хлопец назваў імёны падпольшчыкаў. Раніцай 21 студзеня, калі ўся вёска яшчэ спала, фашысты акружылі яе. Падпольшчыкаў арыштавалі, пасадзілі ў хлеў і выводзілі па аднаму на допыт. Іх доўга білі, мучылі, здзекаваліся, а потым вывелі ў двор. У той жудасны дзень фашысты расстралялі шэсць чалавек, дваіх*

*забралі з сабой і адправілі ў канцлагер, дзе яны загінулі. У Задворанцах устаноўлены памятны знак загінуўшым падпольшчыкам.*



## ЛЮТЫ

### 10 – 75 гадоў з дня нараджэння Эміліі Іванаўны Каламіец, доктара біялагічных навук, члена-карэспандэнта НАН, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, ураджэнкі в.Заполічы



*Нарадзілася ў 1949 годзе ў в.Заполічы. У 1971 годзе закончыла Беларускі політэхнічны інстытут. З 1971 па 2004 год працавала ў Акадэміі навук БССР інжынерам, старшым інжынерам, малодшым, старшым, вядучым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі. У 1999 годзе прысвоена навуковая ступень доктара біялагічных навук. З 2004 па 2012 год – дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі, адначасова загадчык лабараторыі гэтага інстытута, з 2012 года – генеральны дырэктар дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання "Хімічны сінтэз і біятэхналогіі". Э.І.Каламіец стварыла і актыўна развівае айчынную навуковую школу па вывучэнню біягенэза біялагічна актыўных злучэнняў з антымікробным дзеяннем і стварэнню біялагічных сродкаў абароны раслін і жывёл. З'яўляецца аўтарам больш за 460 навуковых прац, у тым ліку чатырох манаграфій, 357 артыкулаў і 22 патэнтаў на вынаходніцтвы. Усе распрацоўкі, якія былі вакананыя пад яе кіраўніцтвам, пасняхова выкарыстоўваюцца ў вытворчасці не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.*

*Э.І.Каламіец прысвоены званні “Заслужаны дзеяч навукі Беларусі” і “Навуковец года НАН Беларусі – 2017”, узнагароджана ордэнам Пашаны (2019).*

## 11 – 105 гадоў з дня нараджэння Аляксея Антонавіча Апрышчанка, першага сакратара Свіслацкага райкама, Героя Сацыялістычнай Працы



*Нарадзіўся 11 лютага 1919 года ў сяле Ніжне-Астахава Кашарскага раёна Растоўскай вобласці ў сялянскай сям’і. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у партызанскім руху ў Гродзенскай вобласці. Пасля заканчэння вайны быў накіраваны на працу ў камсамольскія, а затым у партыйныя органы. У 1962 годзе быў выбраны першым сакратаром Свіслацкага раённага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Пад яго кіраўніцтвам раён стаў перадавым у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Першым у Гродзенскай вобласці Свіслацкі раён укараніў унутрыгаспадарчую і міжгаспадарчую спецыялізацыю. У 1966 годзе А.А.Апрышчанка закончыў вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС у Маскве. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 красавіка 1971 года за выдатныя поспехі, дасягнутыя ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананні пяцігадовага плана продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі, прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля “Серп і молат”. З 1973 года да выхаду на пенсію працаваў галоўным дзяржаўным інспектарам па закупцы і якасці сельскагаспадарчых прадуктаў па Гродзенскай вобласці. Быў дэпутатам раённага Савета, членам райкама і абкама партыі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), Айчыннай вайны 1 ступені (1985), медалямі. З’яўляецца Ганаровым грамадзянінам горада Свіслач.*

# САКАВІК

## 11 – 40 гадоў з часу гібелі ў Афганістане Валерыя Іванавіча Патоцкага, ураджэнца в.Хрышчонавічы. Пасмертна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі



*Нарадзілася 20 снежня 1962 года ў в.Хрышчонавічы. У 1978 годзе закончыў Навасадскую васьмігадовую школу, у 1981 годзе – Жодзінскае ПТВ № 75 імя братоў Купрыянавых. У 1982 годзе прызваны ў Савецкую Армію Смалявіцкім РВК Мінскай вобласці. У студзені 1983 года накіраваны ў Афганістан. Радавы В.І.Патоцкі ў баях дзейнічаў самаадданa і бясстрашна, выяўляючы мужнасць і высокае баявое майстэрства. 11 сакавіка 1984 года ў раёне г.Сурубі правінцыі Кабул загінуў. Пахаваны ў г.п.Поразава. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.*

## 13 – 60 гадоў з дня нараджэння Яўгена Мікалаевіча Місюлі, беларускага лёгкаатлета (спартыўная хадзьба), Заслужанага майстара спорту Рэспублікі Беларусь, чэмпіёна і прызёра чэмпіянатаў СССР, Еўропы і свету, удзельніка трох алімпійскіх гульняў, ураджэнца в.Празнікі



*Нарадзіўся 13 сакавіка 1964 года ў в.Празнікі. Яшчэ са школьных гадоў была цяга да спорту, да спартыўных перамог. А пачыналася ўсё з захаплення бегам, першынства ў школьных, раённых, абласных спаборніцтвах.*

*У 1979 годзе здольнага школьніка запрасілі ў Мінск у Рэспубліканскую школу-інтэрнат спартыўнага профілю. Першым трэнерам яго стаў І.Шаўчэнка. Першапачаткова займаўся толькі бегам, але з дзевятага класа юны спартсмен перайшоў на спартыўную хадзьбу. У новым відзе спорту ў 1982 годзе стаў бронзавым прызёрам розыгрышу Кубка БССР і усесаюзных гульняў сельскіх спартсменаў. У 1983 годзе выканаў нарматыў майстра міжнароднага класа. У 1984 годзе атрымаў перамогу на кубку СССР, у 1986 годзе – на міжнародных спаборніцтвах у Нарвегіі і на Гульнях добрай волі ў Маскве. Паказаўшы добры рэзультат і заняўшы III месца, быў адабраны на сваю першую Алімпіяду ў Сеул. У 1988 годзе ўпершыню паказаў лепшы ў свеце вынік па спартыўнай хадзьбе на дыстанцыі 20 км. Ён стаў першым, хто за такі працяглы час існавання гэтага віду спорту, змог дабіцца вышэйшага рэзультату і трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса. Удзельнічаў у чэмпіянатах свету ў 1991 і 1995 гадах і двойчы фінішыраваў трэцім. У 1995 годзе атрымаў ганаровае званне "Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь". Спартыўная кар'ера закончылася ў 2004 годзе, пасля выступлення на Алімпійскіх гульнях у Афінах. Пакінуўшы вялікі спорт, застаўся ў лёгкай атлетыцы ў якасці трэнера.*

## 16 – 20 гадоў з часу адкрыцця дзяржаўнай ўстановы "Свіслацкі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва"



*Урачыстае адкрыццё Свіслацкага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адбылося 16 сакавіка 2004 года. Першым дырэктарам быў Аляксандр Віктаравіч Хмара. Дзейнасць цэнтра накіравана на аказанне матэрыяльнай дапамогі, сацыяльна-педагагічных, бытавых, кансультацыйных і іншых паслуг, а таксама стварэнне банка даных грамадзян, якія патрабуюць дапамогі. У склад цэнтра*

*уваходзяць 4 аддзяленні і філіял: аддзяленне першаснага прыёму, аналізу, інфармавання, прагназавання і комплекснай падтрымкі ў крызіснай сітуацыі; аддзяленне сацыяльнай дапамогі на даму; аддзяленне сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў; аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту г.Свіслач і філіял г.п.Поразава.*

## КРАСАВІК

### 15 – 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Юльянавіча Агейца, беларускага вучонага, доктара сельскагаспадарчых навук, ураджэнца в.Кусянцы



*Нарадзіўся 15 красавіка 1949 года ў в.Кусянцы. З 1966 па 1971 год вучыўся Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце, з 1974 па 1977 год – у аспірантуры Беларускага навукова-даследчага інстытута глебазнаўства і аграхіміі. Працаваў аграномам птушкафабрыкі "Нёман" (1971), галоўным аграномам калгаса "Знамя коммунизма" (1972-1974), малодшым, старэйным навуковым супрацоўнікам, вядучым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыяй Беларускага навукова-даследчага інстытута глебазнаўства і аграхіміі (1977-1997), дырэктарам РНІУП "Інстытут радыялогіі" (1997-2006), намеснікам дырэктара па навуковай рабоце РНІУП "Інстытут аховы раслін" (2006-2008), намеснікам дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце ДНУ "Батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (2008-2011), в.а. намесніка генеральнага дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце, загадчыкам аддзела насенняводства бульбы РУП "Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве" (2011). З 2012 года займае пасаду дырэктара РУП "Інстытут рыбнай гаспадаркі" РУП "Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі". У 2003 годзе атрымаў*

*вучоную ступень доктара сельскагаспадарчых навук, з'яўляецца членам Міжнароднай акадэміі экалогіі, бяспекі чалавека і прыроды. Удастоены нагруднага знака імя У.М.Ігнатоўскага (2019).*

# МАЙ

## Май – 10 гадоў з часу правядзення пленэра юных мастакоў "Симфония величия Беловежской пущи"

*У 2014 годзе ў Свіслачы ўпершыню на базе дзяржаўнай установы адукацыі "Свіслацкая дзіцячая школа мастацтваў" прайшоў*



*рэгіянальны пленэр юных мастакоў "Симфония величия Беловежской пущи". З 2018 года пленэр набыў статус абласнога. Мерапрыемства праходзіць на тэрыторыі Нацыянальнага парка. Правядзенне пленэра-конкурсу садзейнічае выяўленню адораных і таленавітых навучэнцаў, развіццю мастацкіх здольнасцей і прымяненню ведаў, атрыманых у працэсе навучання, абмену вопытам, удасканаленню прафесійнага майстэрства юных мастакоў. У пленэры прымаюць удзел навучэнцы дзіцячых школ мастацтваў, дзіцячых мастацкіх школ, адукацыйных школ з мастацкім ухілам Гродзенскай вобласці. У 2023 годзе ў мерапрыемтве прынялі ўдзел навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў Баграціёнаўска Калінінградскай вобласці ў рамках праекта "Расія – Беларусь: моцнае партнёрства".*



## 6 – 70 гадоў з дня нараджэння Юрыя Васільевіча Акудовіча, беларускага спартыўнага педагога, майстра спорту СССР па турызму, ураджэнца Свіслачы



*Нарадзіўся 6 мая 1954 года ў Свіслачы. Вучыўся ў Інстытуце фізічнай культуры на кафедры вяслярнага спорту і турызму. З 1979 па 1986 гады ўзначальваў аддзел турызму і спартыўнага арыентавання Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства. У 1992-1995 гады быў прэзідэнтам Турысцка-спартыўнага саюза Беларусі. Працаваў у дзіцячым і прафсаюзным турызме, удзельнічаў больш чым у 20 грамадскіх арганізацыях па турызме – ад раённых да усесаюзных. Быў намеснікам дырэктара кампаніі "Экспобизнестур", якая займалася дзелавым турызмам. За сваё жыццё наведаў каля 50 краін свету. Хадзіў па Палярным Урале, хрыбце Чэрскага, пешшу прайшоў па Алтаі, Саянам, Цянь-Шаню... З'яўляўся актыўным турыстам-воднікам. Любімае месца яго падарожжаў – Нарачанскі край. Удзельнічаў у рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтвах. Неаднаразова выступаў у якасці галоўнага суддзі самых разнастайных спаборніцтваў. Напісаў кнігу "Восхождение на Софруджу".*

## 8 – 50 гадоў з дня нараджэння Аксаны Барысаўны Астроўскай (Бараноўскай), кандыдата медыцынскіх навук, ураджэнкі Свіслачы



*Нарадзілася 8 мая 1974 года ў Свіслачы. У 1997 годзе закончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут па спецыяльнасці "Лячэбная справа", у*

*2007 годзе – аспірантуру пры кафедры медыцынскай біялогіі і агульнай генетыкі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (ГрДМУ). З 2001 па 2007 год – малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі морфа-функцыянальных метадаў даследавання, з 2009 па 2012 год – навуковы супрацоўнік групы электроннай мікраскапіі навукова-даследчай лабараторыі ГрДМУ. З 2012 года працуе старшым навуковым супрацоўнікам групы марфалогіі з электроннай мікраскапіяй навукова-даследчай лабараторыі ГрДМУ. У 2002 годзе атрымала навуковую ступень кандыдата медыцынскіх навук, мае вучоную ступень дацэнта. Аўтар 48 навуковых публікацый, 6 рацыяналізатарскіх прапаноў. Вынікі яе марфалагічных і электронна-мікраскапічных даследаванняў ляглі ў аснову 6 кандыдацкіх дысертацый.*

## 8 – 60 гадоў з дня нараджэння Віктара Яўгеньевіча Лобача, воіна-афганца, ураджэнца в.Грынкі. Пасмертна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі



*Нарадзіўся 22 мая 1964 года ў в.Грынкі. У 1981 годзе закончыў Грынкаўскую сярэднюю школу, працаваў трактарыстам у калгасе імя К.Каліноўскага. Ва Узброеныя Сілы СССР прызваны ў 1982 годзе. У Рэспубліцы Афганістан служыў механікам-вадзіцелем БМП са студзеня 1983 года. 14 сакавіка 1983 года ў складзе атрада забеспячэння руху ўступіў у бой з мяцежнікамі, абстраляўшымі калону. Праціўнік паспрабаваў захапіць трох параненых салдат. Віктар выскачыў на адкрытае месца і, страляючы з аўтамата, адцягнуў агонь мяцежнікаў на сябе. Параненыя былі выратаваныя, але Віктар загінуў. За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна). Пахаваны ў горадзе Свіслач.*

# ЧЭРВЕНЬ

## 2 – 75 гадоў з дня нараджэння Марыі Міхайлаўны Біруковай, беларускага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, ураджэнкі в. Лашавічы



*Нарадзілася 2 чэрвеня 1949 года ў в.Лашавічы. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я.Купалы. Працоўную дзейнасць пачала загадчыкам Велікасельскай сельскай бібліятэкі. Працавала настаўнікам Карэвіцкай і Ятвескай васьмігадовых школ, Сакольніцкай сярэдняй школы. З 1971 года – загадчык аддзелам прапаганды і культурна-масавай работы, затым – другі сакратар Свіслацкага райкама ЛКСМБ. У 1974 годзе камсамольскага лідэра Свіслаччыны рэкамендуюць на працу ў Гродна. Займала пасаду спачатку другога, а потым першага сакратара Гродзенскага абкама ЛКСМБ. У 1981 годзе – сакратар ЦК ЛКСМБ, у 1983 годзе – сакратар Гродзенскага абкама КПБ. Закончыла з адзнакай Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС у Маскве. З 1991 года працавала ў Гродзенскім аблвыканкаме: намеснікам загадчыка сацыяльна-гуманітарнага аддзела, начальнікам упраўлення арганізацыйна-кадравай работы. З 1997 года – намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама. У 2008 годзе выбрана дэпутатам Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4-га склікання. Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і узнагароды Беларускай праваслаўнай царквы: ордэн Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай і ордэн прападобнай Ефрасінні Полацкай. Узнагароджана ордэнамі “Знак Пашаны” і Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, 16 медалямі. Па выніках 2011 года Марыя Міхайлаўна прызнана чалавекам года Гродзеншчыны. Яе імя занесена ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці.*

## 7 – 40 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Сяргеевіча Белюка, кандыдата медыцынскіх навук, дацэнта, ураджэнца Свіслачы



*Нарадзіўся 7 чэрвеня 1984 года ў Свіслачы. У 2007 годзе закончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт па спецыяльнасці "Лячэбна-прафілактычная справа". Працаваў урачом-стажорам, хірургам па аказанні экстранай медыцынскай дапамогі ў Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы. З 2008 па 2011 год вучыўся ў аспірантуры 1-ай кафедры хірургічных захворванняў. З 2011 года – асістэнт, з 2017 года – дацэнт 1-й кафедры хірургічных захворванняў Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта. 9 снежня 2011 года абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата медыцынскіх навук. У 2013 годзе стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітых маладых вучоных. З'яўляецца членам Беларускага таварыства хірургаў, Беларускай Асацыяцыі ўрачоў. К.С.Белюк – аўтар і сааўтар 185 тэзісаў і матэрыялаў навуковых з'ездаў і канферэнцый, 13 артыкулаў у рэцэнзуемых навуковых выданнях, 5 патэнтаў Рэспублікі Беларусь, 6 актаў аб укараненні вынікаў навуковых даследаванняў у лячэбную практыку і 8 пасведчанняў на рацыяналізатарскую прапанову. Неаднаразова з'яўляўся ўдзельнікам унутрывузаўскіх, рэспубліканскіх, міжнародных навуковых канферэнцый.*

## 22 – 5 гадоў з дня асвяшчэння царквы Ражства Прасвятой Багародзіцы ў Свіслачы



*Царква Ражства Прасвятой Багародзіцы – мураваны праваслаўны храм. Закладка яе адбылася ў 2001 годзе епіскапам Гродзенскім і Ваўкавыскім Арцеміем. 18 жніўня 2009 года на храм і званіцу былі ўсталяваны купалы.*

*26 ліпеня 2013 года ўказам архіепіскапа Арцемія на пасаду святара прыходу храма быў прызначаны іерэй Сергій Тарасевіч. 22 чэрвеня 2019 года для праваслаўных хрысціян Свіслачы адбылася знакавая падзея, да якой ішлі не адзін дзясятак гадоў – асвешчана царква Ражства Прасвятой Багародзіцы. Боскую літургію ўзначаліў архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій, саслужылі яму сакратар Гродзенскай епархіі мітрафорны протаіерэй А.Ненартовіч, духавенства Свіслацкага і Берастават̆цкага благачыння, а таксама благачынны Крупскай царкоўнай акругі, настаяцель прыхода храма Свяціцеля Мікалая Цудатворца г.Крупкі протаіерэй М.Гмір.*



## ЛІПЕНЬ

## Ліпень – 20 гадоў з часу адкрыцця аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры дзяржаўнай установы культуры "Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці"



*Асноўнымі напрамкамі дзейнасці аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры, які расчыніў свае дзверы ў ліпені 2004 года, з'яўляецца адраджэнне, захаванне і развіццё традыцыйных народных рамёстваў, перадача вопыту шырокім слаям насельніцтва, асабліва дзецям і моладзі. Пры аддзеле працуе выстава-продаж сувеніраў ручной работы. Тут можна набыць вырабы з гліны і дрэва, саломкі і скуры, традыцыйныя беларускія паясы, вязаныя цацкі і многае іншае. У выставачнай зале створаны "куток" чорназадымленнай керамікі, сабраны матэрыялы пра жыццё і*



творчасць вядомых не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі ганчароў, братоў Шопікаў з Поразава. Усе жадаючыя могуць прыняць удзел у майстар-класах, на якіх майстры дапамогуць стварыць сваімі рукамі сувенір на памяць па розных відах творчасці: пляценне пояса, бранзалета, саломапляценне, ганчарства, дробная пластыка з гліны, выраб лялек-абярэгаў і інш.

## 5 – 15 гадоў з часу адкрыцця Памятнага знака воінам-інтэрнацыяналістам у Свіслачы



Урачыстае адкрыццё адбылося 5 ліпеня 2009 года. Памятны знак салдатам неабвешчанай вайны, як значыцца на мемарыяльнай дошцы, уяўляе сабой двухметровы камень, над якім узнімаецца ў неба арол – сімвал мужнасці, вернасці і гонару. Адным сваім крылом ён датыкаецца валуна, нібы ўбіраючы ў сябе душы загінуўшых воінаў. Побач з 10-канцовай зоркай, якая сімвалізуе 10 гадоў афганскай вайны, на мемарыяльнай дошцы напісаны імёны загінуўшых свіслацкіх воінаў-інтэрнацыяналістаў. Аўтарам Памятнага знака з’яўляецца вядомы скульптар А.С.Анціпін.

## 16 – 35 гадоў з часу адкрыцця мемарыяла-помніка “Асілак” у Свіслачы



Мемарыяльны комплекс “Асілак” узведзены ў памяць жыхароў Свіслаччыны, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Быў адкрыты ў 45-ую гадавіну вызвалення Свіслачы ад

*нямецка-фашысцкай акупацыі 16 ліпеня 1989 года. Аўтарам помніка з'яўляецца П.А.Цомпель. У кампазіцыю мемарыяла ўваходзіць: скульптура, гармата, БМД-1 і мемарыяльныя пліты, на якіх нанесены прозвішчы 1162 свіслачан, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Мемарыял займае плошчу ў 1,2 гектара. Галоўны элемент – скульптура абаронца зямлі беларускай "Асілак", створаная са зварных медных лістоў вышынёй каля 14 метраў. Па задумцы аўтара, скульптура беларускага волата – гэта сімвал Свіслацкай зямлі і помнік воінам-вызваліцелям, што са зброяй у руках прынеслі на гэтую зямлю мір у гады Вялікай Айчыннай вайны.*



## 17 – 80 гадоў з дня вызвалення Свіслаччыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

*Вызваленне Свіслачы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адзначана ў вячэрняй зводцы Савінфармбюро за 17 ліпеня 1944 года. Вось што ў ёй гаварылася: "На северо-запад Волковыска части Н-ского соединения, развивая наступление, овладели районным центром Белостокской области городом Свислочь, а также с боем заняли более 100 населенных пунктов, в том числе железнодорожные станции "Берестовица", "Андреевичи", "Рудавка", "Свислочь". В упорных боях уничтожено более 1000 вражеских солдат и офицеров, уничтожено 6 немецких танков и 24 орудия. Захвачено 11 орудий и 48 пулеметов. Захваченно 200 пленных". Акупацыя Свіслаччыны працягвалася 1116 дзён і начэй. За тры гады акупацыі раёна фашысты расстралялі, павесілі, замучылі 5213 жыхароў, цалкам спалілі 8 вёсак (Ціхаволя, Тушамля, Броўск, Навасёлкі, Доўгі Барок, Немержанка, Цераспаль, Язвіны), 366 сялянскіх падворкаў. Амаль цалкам была спалена Свіслач, знішчаны і разграблены прамысловыя прадпрыемствы, гаспадаркі, помнікі культуры і архітэктуры. Абсталяванне знакамітых свіслацкіх гарбарных фабрык было вывезена немцамі ў Германію.*

## 17 – 80 гадоў з дня адкрыцця раённай бальніцы

*17 ліпеня 1944 года быў выдадзены загад № 1 аб заснаванні раённай бальніцы. Бальніца размясцілася ў в.Пацуі і мела 25 коек. Там працавалі ўрач, фельчар, акушэрка і 2 санітаркі. Дзейнічалі 3 аддзяленні: агульнатэрапеўтычнае, інфекцыйнае і радзільнае ў в.Ражкі. Праз 2 гады ў прыватным доме па вуліцы Свярдлова ў Свіслачы адкрываецца раённая амбулаторыя з жаноча-дзіцячай кансультацыяй. Уводзяцца ў штатнае расписанне пасады педыятраў, акушэр-гінеколагаў, дзіцячых медсясцёр і акушэрак. У 1948 годзе райбальніца налічвала 50 коек, адкрылася станцыя хуткай дапамогі з 2 медработнікамі. У 1949 годзе пачынаецца аднаўленне пад бальніцу будынка згарэўшай у час вайны настаўніцкай семінарыі. У 1955 годзе з мэтай укамплектавання кадрамі медыцынскіх установ пры раённай бальніцы адкрыты двухгадовыя курсы медсясцёр, якія закончылі 35 чалавек. У 1956 годзе галоўным урачом назначаецца М.А.Турко. Пад яго кіраўніцтвам рэканструяваны памяшканні пад лячэбныя ўстановы, бальніца расшырана на 310 коек, адкрыты супрацьтуберкулёзны дыспансер на 75 коек, выведзены з наёмных памяшканняў 23 ФАПа, уведзены ў эксплуатацыю 5-этажны корпус бальніцы. У той час працавала загадчыкам радзільнага аддзялення А.Р.Даманава. Яна стала арганізатарам цэнтралізаваных медыка-сацыяльных і лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў, якія праводзяцца пры неабходнасці падчас цяжарнасці, родаў і ў пасляродавы перыяд. На гэтым матэрыяле яна абараніла кандыдацкую дысертацыю. У 1968 годзе пабудаваны новы будынак райпаліклінікі, што дазволіла значна палепшыць умовы працы медперсанала і якасць абслугования насельніцтва. У 1978 годзе калектыў медыцынскіх работнікаў раёна ўзнагароджаны Пераходным Чырвоным Сцягам Міністэрства аховы здароўя БССР*


К выезду готовятся медработники открытой в 1948 году станции скорой помощи.



*у сацспаборніцтвах “За дасягнутыя поспехі ў ахове здароўя насельніцтва”, упершыню арганізаваных ў БССР. Свіслацкая раённая бальніца прызнана школай перадавога вопыту работы ў рэспубліцы. За апошнія дзесяцігоддзі набыта новае абсталяванне, значна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы. У раёне функцыяніруюць 11 ФАПаў і 5 амбулаторый, 2 пункты хуткай дапамогі. Установы аховы здароўя раёна маюць*



*устойлівыя паказчыкі дзейнасці, што дазваляе медыцынскім работнікам займаць прызавыя месцы сярод раёнаў вобласці ў штогадовых аглядах-конкурсах “За павышэнне якасці медыцынскай дапамогі насельніцтву і канчатковыя вынікі дзейнасці ўстаноў аховы здароўя”.*

## ЖНІВЕНЬ

### 1 – 80 гадоў з часу фарміравання Свіслацкага раённага ваеннага камісарыята

*Свіслацкі раённы ваенны камісарыят быў утвораны 1 жніўня 1944 года. На яго ўскладаліся наступныя задачы: весці ўлік ваеннаабавязаных, праводзіць першапачатковае ваеннае навучанне і ажыццяўляць прызывы ва Узброеныя Сілы СССР. Ваенкомам быў старшы лейтэнант Ф.П.Фралоў. За ўсю*



*гісторыю існавання Свіслацкага раённага ваеннага камісарыята ім кіравала 15 камісараў, 6 з іх – жыхары нашага раёна: В.Хахлоў, У.Жукаў, А.Чарада, В.Жук, В.Салдатаў. У жніўні 2014 года адбылася рэарганізацыя, Свіслацкі ваенкамат быў далучаны да ваеннага камісарыята Ваўкавыскага раёна. Так з’явілася адасобленая група Свіслацкага раёна, якая выконвае функцыі ваеннага камісарыята на тэрыторыі раёна. Першым начальнікам адасобленай групы Свіслацкага раёна стаў А.Буйко. У цяперашні*

*час групай кіруе І.Ушанаў. На адасобленую групу ўскладзены дзве асноўныя функцыі: ваенна-мабілізацыйная і ўлікова-прызыўная. Асноўнымі задачамі з'яўляецца выкананне мерапрыемстваў вайсковай мабілізацыі, а ў мірны час прызыў грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве і на ваенныя зборы. Акрамя гэтага, спецыялісты адасобленай групы ажыццяўляюць адбор кандыдатаў для паступлення ў ваенныя навучальныя ўстановы, на ваенную службу па кантракту, займаюцца пытаннямі ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі.*

## 6 – 125 гадоў з часу адкрыцця Свіслацкай раённай бібліятэкі



*На падставе распараджэння Гродзенскага губернатара датай заснавання Свіслацкай бібліятэкі лічыцца 6 жніўня 1899 года. Першым бібліятэкарам быў І.І.Кавалеўскі, які меў гімназічную адукацыю і любіў кнігі. Карыстанне кнігамі, праца бібліятэкара былі бясплатнымі. Першыя яе чытачы – выкладчыкі, навучэнцы Свіслацкай настаўніцкай семінарыі, сяляне. У 1913 годзе кніжны фонд бібліятэкі перадаецца ў распараджэнне бібліятэкі семінарыі. Летам 1915 года Свіслач акупіравана нямецкімі войскамі. Частку кніг з бібліятэкі немцы спалілі, большую частку фонду мясцовыя жыхары выратавалі. Бібліятэка часова спыніла сваё існаванне. У ліпені 1920 года пасля вызвалення Гродзенскай губерніі ад акупацыі польскімі войскамі, бібліятэка арганізавана ў будынку Рэўкама. Добраахвотнымі ахвяраваннямі свіслачан было сабрана каля 300 кніг. З далучэннем Заходняй Беларусі да Польшчы бібліятэку зноў закрываюць. Пасля ўсталявання савецкай улады ў Свіслачы зноў адкрываецца народная бібліятэка ў будынку гімназіі. Аснову яе фондаў складае літаратура бібліятэкі Таварыства беларускай школы. У бібліятэку паступаюць кнігі з Мінска і Беластока. Да канца 1940 года іх налічваецца больш за 1000 экзэмпляраў. Бібліятэку наведваюць 205 чалавек. У гады Вялікай Айчыннай вайны бібліятэка зноў зачыняецца, яе фонды разкрадзены і*

спалены. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 года Савет Народных камісараў Беларускай ССР выдае пастанову аб аднаўленні дзейнасці бібліятэкі. Для раённай бібліятэкі вылучаецца пакой пры партыйным кабінеце. Паступова папаўняецца кніжны фонд. Ужо ў першыя месяцы работы было сабрана звыш 800 кніг. У 1978 годзе 41 бібліятэка раёна аб’ядналася ў цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму. Раённая бібліятэка стала цэнтральнай бібліятэкай, метадычным цэнтрам для бібліятэк ЦБС, ажыццяўляючы метадычную дапамогу і кіраўніцтва. У 1999 годзе бібліятэка размясцілася ў рэканструяваным будынку былога



РДК і адзначыла 100-гадовы юбілей. Сёння Свіслацкая раённая



бібліятэка займае значнае месца ў сацыяльна-культурным жыцці раёна, з’яўляецца інфармацыйна-адукацыйным цэнтрам. Для павышэння прававой культуры насельніцтва, забеспячэння доступу карыстальнікаў да дакументаў заканадаўча-прававога характару ў 2002 годзе пры бібліятэцы створаны публічны цэнтр прававой інфармацыі. З 2007 года працуе перасоўная бібліятэка-бібліобус, мэта якой – абслугоўванне літаратурай насельніцтва аддаленых населеных пунктаў, дзе адсутнічаюць стацыянарныя бібліятэкі. З 2009 года абслугоўванне чытачоў



вядзецца ў аўтаматызаваным рэжыме. Свіслацкая раённая бібліятэка – актыўная ўдзельніца рэспубліканскіх, абласных, раённых конкурсаў, акцый, мерапрыемстваў.

### 24 – 45 гадоў з часу адкрыцця для наведвальнікаў установы культуры “Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей”



*Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей размяшчаецца ў адным з найстарэйшых будынкаў горада, пабудаваным у 1907 годзе. Рашэннем выканкама Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 12.04.1976 № 167 у Свіслачы быў адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей. Для наведвальнікаў экспазіцыя музея пачала працаваць з 24 жніўня 1979 года. Першая зала экспазіцыі “Гісторыя мястэчка Свіслач” прысвечана гісторыі Свіслаччыны са старажытных часоў да 1900 года. Другая зала прысвечана ваенным падзеям, якія праходзілі ў нашым краі ў розныя перыяды гісторыі: вайна 1812 года, Першая Сусветная вайна і Вялікая Айчынная вайна. У экспазіцыі таксама адлюстраваны актуальныя тэмы: Свіслаччына ў гады польскай акупацыі 1921-1939 гадоў і генацыду беларускага народа 1941-1944 гадоў. Колькасць экспанатаў асноўнага фонду музея складае больш за 8 тысяч адзінак, навукова-дапаможнага фонду – больш за 4,6 тысяч адзінак. Штогод музей наведвае больш за 5 тысяч чалавек, праводзіцца больш за 280 экскурсій. Акрамя правядзення выстаў і экскурсій, музей займаецца аховай аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Свіслацкага раёна.*

## ВЕРАСЕНЬ

### 1 – 35 гадоў з часу стварэння танцавальнага калектыву “Усмешка” дзяржаўнай установы культуры “Свілацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”



*Танцавальны калектыў “Усмешка” створаны 1 верасня 1989 года. Мэта яго – папулярызацыя харэаграфічнага мастацтва сярод дзяцей і моладзі, знаёмства падрастаючага пакалення з рознымі стылямі і напрамкамі харэаграфіі, а таксама творчае развіццё асобы дзіцяці. 25 мая 1999 года танцавальнаму калектыву прысвоена званне “узорны”. “Усмешка” з’яўляецца пастаянным удзельнікам абласных, раённых фестываляў і конкурсаў (абласны фестываль дзіцячай эстраднай творчасці “Масты надзей”, абласны адкрыты фестываль “Гарадзенскія карункі”, адкрыты рэгіянальны фестываль-конкурс дзіцячай аматарскай харэаграфічнай творчасці “Хрустальный башмачок” і інш.). Выступленні калектыву карыстаюцца вялікай папулярнасцю не толькі сярод свіслачан, але і сярод жыхароў іншых гарадоў Беларусі. Кіраўніком танцавальнага калектыву з’яўляецца А.М.Балюк.*

## 20 – 65 гадоў з дня нараджэння беларускага кампазітара Яўгена Уладзіміравіча Паплаўскага, ураджэнца г.п.Поразава



*Нарадзіўся 20 верасня 1959 года ў г.п.Поразава. У 1986 годзе закончыў Беларускую кансерваторыю. Аўтар сімфанічных, харавых, камерна-інструментальных і вакальных твораў, даследчык гісторыі музычнага жыцця на беларускай зямлі ў мінулыя стагоддзі. Быў адным з заснавальнікаў і дырэктарам (да 1996 г.) Нацыянальнага тэатральна-канцэртнага аб’яднання “Беларуская Капэла”, мэтай якога з’яўляецца пошук, вывучэнне і ўвядзенне ў выканальніцкую практыку старадаўняй беларускай музыкі. Актыўна і плённа працаваў у архівах бібліятэк Лондана, Кракава, Варшавы, Познані,*

*Гданьска і Санкт-Пецярбурга. Знойдзеныя матэрыялы сталі асновай рэпертуару штогадовага фестывалю “Адраджэнне беларускай капэлы”. З’яўляецца аўтарам сцэнарыя балета “Тэагонія”. Паводле яго драматургічнай ідэі ў 1995 годзе быў пастаўлены балет “Паланэз” на музыку М.К.Агінскага. Я.У.Паплаўскі – лаурэат ІІ прэміі за сімфонію “Lux aeterna” для тэнара, хору і сімфанічнага аркестра (Нацыянальны конкурс кампазітараў, прысвечаны 500-годдзю Ф.Скарыны, 1991), ІІ прэміі ў намінацыі “Творы для камернага хору” за харавы цыкл “Пагода ўжо позняй восені” (Міжнародны конкурс кампазітараў “Jihlava-2000” у Празе). Творы Яўгена Уладзіміравіча выконваліся на міжнародных фестывалях сучаснай музыкі ў Расіі, Нідэрландах, Італіі, Іспаніі, ЗША і ў іншых краінах. Сваю малую радзіму ўвекавечыў у сімфанічных эскізах “Поразава”. З’яўляецца членам Беларускага саюза кампазітараў, дацэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

## КАСТРЫЧНІК

### 22 – 65 гадоў з дня нараджэння Віктара Аляксандравіча Сняжыцкага, доктара медыцынскіх навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, ураджэнца в.Гарнастаевічы



*Нарадзілася 22 кастрычніка 1959 года ў в.Гарнастаевічы. У 1984 годзе закончыў з адзнакай Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці “Лячэбная справа”. У 1984-1986 гадах працаваў клінічным ардынатарам кафедры шпітальнай тэрапіі Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. У 1989 годзе закончыў аспірантуру па спецыяльнасці “Унутраныя хваробы”. У 1989-1995 гадах – асістэнт кафедры*

*шпітальнай тэрапіі, у 1995-2001 гадах – загадчык аддзяленнем, у 2001-2006 гадах – галоўны ўрач Гродзенскага абласнога кардыялагічнага дыспансера. У 2004 годзе атрымаў вучонае званне дацэнта кафедры шпітальнай тэрапіі, у 2006 годзе – званне прафесара. З 2006 па 2009 год – прарэктар па навуковай працы, з 2009 па 2010 год – першы прарэктар, з 2010 па 2020 год – рэктар Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Закончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання ад Гродзенскай вобласці. З'яўляецца членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Аўтар звыш 560 навуковых прац, у тым ліку 16 манаграфій і кніг, 12 вучэбных дапаможнікаў, 35 патэнтаў. Мае ўзнагароды: знак "Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь" (2007), медаль Свяціцеля Кірылы Тураўскага Беларускай Праваслаўнай царквы (2011), медаль Францыска Скарыны (2014), ганаровае званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" (2020).*

## СНЕЖАНЬ

### Снежань – 80 гадоў з часу ўтварэння Свіслацкай фабрыкі лазовай мэблі

*Свіслацкая фабрыка лазовай мэблі – адно з прадпрыемстваў, прадстаўляючых прамысловасць раёна. Галоўным напрамкам яго дзейнасці з'яўляецца перапрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з яе. Свой летапіс прадпрыемства пачало са снежня 1944 года. Тады гэта быў Поразаўскі райпрамкамбінат. У яго склад уваходзілі лесазавод, воўначасалка, сталярная, колавая і кавальскія майстэрні, цагляныя заводы, бандарны і ганчарны цэхі, вапнавы завод. У 1981 годзе прадпрыемства атрымала сваю цяперашнюю назву. Тады і сталі выраблять на фабрыцы вырабы з лазы, пераняўшы вопыт лозапляцення ў чарнігаўскіх рабочых. У 2010 годзе фабрыка перапрафілявалася на выпуск новага асартыменту прадукцыі: дыверсіфікавала вытворчасць як па відах дзейнасці, так і па арыентацыі на розных заказчыкаў. Набыццё*

*сучаснага абсталявання дазволіла ўдасканаліць якасць выпускаемай прадукцыі, павысіць яе канкурэнтаздольнасць на ўнутраным рынку. На прадпрыемстве наладжаны поўны цыкл дрэвaапрацоўкі. Гэта і лесанарыхтоўка, і лесапілаванне,*






*сушка піламатэрыялаў і далейшая глыбокая перапрацоўка. У 2012 годзе Свіслацкая фабрыка лазовай мэблі стала вытворчым участкам ААТ «Гроднапрамбуд», тым самым набыўшы надзейнага памочніка і асноўнага заказчыка.*

## Снежань – 20 гадоў з часу выдання кнігі-хронікі "Памяць. Свіслацкі раён"

*У снежні 2004 года ў выдавецтве "Беларусь" выйшла гісторыка-дакументальная хроніка "Памяць. Свіслацкі раён". Яе тыраж склаў 3000 экзэмпляраў. У кнізе асвятляецца гісторыя Свіслаччыны ад старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра цікавыя падзеі, што адбываліся, пра знакамітых людзей, якія былі звязаны лёсам з краем. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны ўдзельнікаў падзей.*




## 9 – 90 гадоў з дня нараджэння Лявонція Пятровіча Фурсы, майстра спорту СССР, Заслужанага трэнера Беларусі, Ганаровага грамадзяніна горада Гродна, ураджэнца Свіслачы



*Нарадзіўся 9 снежня 1934 года ў Свіслачы. У 1953 годзе закончыў Свіслацкую сярэднюю школу, у 1957 годзе – Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры. Адпрацаваўшы адзін год у Мінску, прыехаў у Свіслач і паклаў пачатак развіццю вольнай барацьбы на Гродзеншчыне. Ужо ў 1955 годзе каманда Гродзенскай вобласці пад кіраўніцтвам Лявонція Пятровіча складалася ў асноўным са свіслацкіх спартсменаў. Працоўная дзейнасць у Гродна пачалася ў 1957 годзе ў Гродзенскай абласной школе вышэйшага спартыўнага майстэрства. Доўгі час знаходзіўся на пасадзе старшага трэнера па вольнай барацьбе Гродзенскай вобласці. У маладосці выканаў нарматыў майстра спорту, у 1968 годзе стаў заслужаным трэнерам БССР, у 1980 годзе была прысвоена судзейская міжнародная катэгорыя. Звання “Ганаровы грамадзянін горада Гродна” удастоены ў 2004 годзе. Сярод яго выхаванцаў больш за 100 майстроў спорту па вольнай барацьбе, у ліку якіх 2 удзельнікі Алімпійскіх гульняў, 5 Заслужаных трэнераў Беларускай ССР. Яго вучні атрымалі больш за 35 медалёў на чэмпіянатах СССР, Еўропы і свету. Па выніках 2012 года Л.Фурса прызнаны лепшым трэнерам па вольнай барацьбе ў Беларусі за падрыхтоўку спартсменаў-юніёраў сярод дзяўчат. Памёр 3 лістапада 2020 года. Штогод у Гродна праводзіцца турнір па вольнай барацьбе на прызы ганаровага грамадзяніна г. Гродна Л.П.Фурсы.*

## 11 – 5 гадоў з часу занясення Паразаўскай банкухі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

*Назва “банкуха” у Поразава замацавалася ў 30-х гадах ХХ ст. Менавіта ў гэтай мясцовасці банкуху здаўна ўключалі ў мясцовую святочную кухню і захавалі як каштоўную для супольнасці кулінарную традыцыю. Поразаўская банкуха – незвычайны*

*кандытарскі выраб, знешне падобны на калючую ялінку, які нагадвае ў разрэзе малюнак спіленага дрэва. У Поразава ўменнем выпякаць банкуху валодаюць гаспадыні з некалькіх сямей у трох пакаленнях. 11 снежня 2019 года Поразаўская банкуха папоўніла Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*



## 29 – 70 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Міхайлавіча Зеня, кандыдата заатэхнічных навук, ураджэнца в.Грынкі



*Нарадзіўся 29 снежня 1954 года ў в.Грынкі. Закончыў у 1980 годзе зааінжынерны факультэт Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. У 1984 годзе атрымаў навуковую ступень кандыдата сельскагаспадарчых навук, у 1991 годзе – вучонае званне дацэнта. З'яўляўся асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры ветэрынарыі, дацэнтам кафедры гігіены жывёл, дэканам факультэта завочнага навучання Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. Сааўтар падручніка "Гигиена животных" і навучальнага дапаможніка "Зоогигиена с основами проектирования животноводческих объектов". Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Граматай Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. З'яўляецца членам Рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па завочнай адукацыі.*